# ПА-СКАРЫНАЎСКУ!

## Беларусы першымі ў свеце стварылі кнігу па старажытных тэхналогіях

**Сёлета да Дня беларускага пісьменства і друку мы маем вельмі арыгінальны, прыемны падарунак. Пад кіраўніцтвам і па ідэі калекцыянера, гісторыка Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА надрукавана старажытным спосабам і будзе прадстаўлена шырокай грамадскасці першая кніга Бібліі Францыска Скарыны.**



Фота БЕЛТА

Падкрэслім, што гэта не факсімільнае перавыданне, а арыгінальная, хоць і новастворaная кніга. Уладзімір Ліхадзедаў расказаў, што хацелася зрабіць штосьці незвычайнае да свята пісьменства і друку — так і з'явілася ідэя аднаўлення першай кнігі першадрукара. Каб увасобіць задуму ў жыццё, даследчык стаў вывучаць гісторыю друкарскай справы. «Хадзіць па слядах Скарыны», — як ён сам адзначыў. Ліхадзедаў наведаў музеі друкарскай справы ў Базылі, Лейпцыгу, глядзеў, які быў калісьці друкарскі варштат, высвятляў, з чаго рабілі паперу.

Толькі сабраўшы дастатковую навуковую базу, прыступілі да працы. Друкарскі станок аднавілі па гравюры XVI стагоддзя. Станок атрымаўся цалкам сапраўдным — падобных яму ў свеце ўсяго некалькі. Паперу таксама зрабілі самастойна — з ільну, метадам чарпання, як і ў старажытнасці. Такім чынам было надрукавана сем экзэмпляраў першай кнігі Бібліі — Быцця — якія адпавядаюць гістарычным аналагам.

Стваральнікі кнігі ваганіся наконт афармлення вокладкі. Спачатку спрабавалі зрабіць скураны пераплёт. Аднак знешні выгляд атрымліваўся занадта сучасным. Да таго ж пераплётам вокладкі ў старажытнасці часта займаліся майстры, якія не мелі дачынення да самога друкавання. Таму ў выніку пошукаў спыніліся на мяккім пераплёце кнігі — такі Ліхадзедаў бачыў у музеі ў Базылі. Таксама было вырашана расфарбаваць вокладкі кніг. Гэта даручылі зрабіць мастаку Барысу Цітовічу: тыя малюнкі, якія былі ўнутры выданняў Скарыны, перанеслі на вокладку.

СТАР. 2

# ПА-СКАРЫНАЎСКУ!

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*



Фота БЕЛТА.

Па словах **Уладзіміра ЛІХАДЗЕДАВА**, дагэтуль ў свеце па старажытных тэхналогіях перавыдаваліся толькі асобныя старонкі. А тое, што цэлая кніга выдадзена аўтэнтычным спосабам, — гэта прэцэдэнт. Мы аказаліся першымі.

Кніга займела высокую ацэнку экспертаў з Санкт-Пецярбурга, Масквы, а таксама прадстаўніка Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алеся Сушы. Яны з жартам заўважылі, што ў кнігі толькі адзін «недахоп»: яна новая!

Госці свята беларускага пісьменства ў суботу 6 верасня змогуць не толькі ўбачыць гэтыя перавыдадзеныя кнігі Скарыны, дакрануцца да іх, адчуць водар ільняной паперы — увесь тэхналагічны працэс будзе прадстаўлены ў спецыяльным павільёне ў Заслаўі. Кожны ахвотны зможа сам аддрукаваць старонку па скарынаўскай тэхналогіі. Таксама можна будзе назіраць, як ствараецца папера метадам чарпання.

На прэс-канферэнцыі, дзе журналістам прэзентавалі новую кнігу Бібліі, **намеснік міністра інфармацыі Уладзімір МАТУСЕВІЧ** акцэнтаваў увагу на тым, што на гэтыя выхадныя варта паехаць у Заслаўе:

— За час свайго правядзення свята беларускага пісьменства набыло сапраўды агульнанацыянальны характар і стала асяродкам беларускай духоўнасці, культуры і друкаванага слова. Прайшоўшы праз усю Беларусь, сёлета, ужо ў другі раз яно завітала ў старажытнае Заслаўе. Гэта горад з даўняй гісторыя, у якім яскрава адчуваецца подых часу. Сёлета ўпершыню свята паўнавартасна будзе праходзіць на працягу двух дзён — 6 і 7 верасня. Урачыстае адкрыццё адбудзецца ў суботу ў 20.30. Фестываль кнігі, прэзентацыя сродкаў масавай інфармацыі, выдавецтваў, адкрыццё помніка князю Ізяславу, адкрыццё парку культуры і адпачынку, сустрэчы з пісьменнікамі — гэта далёка не поўны пералік запланаваных падзей. 7 верасня на галоўнай сцэне Заслаўя пройдзе ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання пераможцаў Рэспубліканскага конкурсу на лепшы літаратурны твор 2013 года.



Фота БЕЛТА.

Паралельна з Заслаўем у суботу ў Мінску ў 10.00 у Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі пройдзе міжнародны «круглы стол» на тэму «Сугучча. Літаратура як люстэрка эпохі». Спецыяльна для ўдзелу ў ім у беларускую сталіцу з'едуцца пісьменнікі з Сербіі, Азербайджана, Малдовы, Расіі і іншых краін. Дарэчы, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда» Алесь Карлюкевіч будзе мадэратарам гэтай міжнароднай сустрэчы літаратараў.

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ.**